■ Зорны госць

Кірыл ШЫМКО:

«ЛЮБЛЮ ЗДЗІЎЛЯЦЬ ЛЮДЗЕЙ І РАЗБУРАЦЬ СТЭРЭАТЫПЫ»

РЭКАРДСМЕН КНІГІ РЭКОРДАЎ ГІНЕСА — ПРА ФІЛАСОФІЮ СВАЙГО ЖЫЦЦЯ

Кірыл Шымко з дапамогай уласнай сілы рухаў чыгуначныя саставы, танкі, самалёты і вежавыя краны, такога ў свеце не рабіў ніхто. Здаецца, па заслугах яго можна назваць самым моцным чалавекам планеты, аднак сам стронгмен адмаўляецца ад такога прозвішча. Пра яго здымаюць фільмы замежныя тэлекампаніі, называючы Кірыла сімвалам Беларусі, а ён кажа, што сціпласць — адна з галоўных якасцяў чалавека. Вядомы асілак, волат нашага часу сцвярджае, што яго занятак — гэта ўжо не спорт, а філасофія жыцця.

«Проста хацелася быць моцным»

У дзяцінстве Кірыл ніколі не займаўся цяжкай атлетыкай, ён гуляў у баскетбол на даволі высокім узроўні, некаторы час быў захоплены барацьбой, але вырашыў не звязваць сваё жыццё з прафесійным спортам. Прычынай гэтаму паслужылі і траўмы, і думкі бацькоў. Сёння стронгмен удзячны лёсу, што яго жыццё склалася менавіта так.

— З прычыны гэтага я заняўся цяжкім рамяством, напэўна, так я назваў бы сваё захапленне. Спорт пачынаецца і заканчваецца, а ў маім выпадку — гэта ўжо мая сутнасць.

У дзяцінстве мне, як і ўсім хлапчукам, проста хацелася быць дужым. Мы ж усе раслі на казках пра волатаў і міфах пра іх вялікія здзяйсненні. У трэнажорнай зале ўбачыў сапраўдных атлетаў — і мне захацелася на іх раўняцца. Я трэніраваўся ўсё сур'ёзней. Па тэлевізары неяк убачыў спаборніцтвы наймацнейшых людзей планеты, дзе падымаюць камяні, бочкі і іншыя цяжкія прадметы, захацелася паспрабаваць там свае сілы. Трэба сказаць, што на гэтых турнірах у мяне былі як перамогі, так і паражэнні. З часам цікавасць да такіх спаборніцтваў прапала, захацелася рабіць тое, што не рабіў ніхто, так і з'явілася гісторыя з перамяшчэннем звышцяжкіх прадметаў.

«Рэкорды — не самамэта»

У 2006 годзе Кірылу Шымко ўдалося зрушыць «боінг-737», вага якога 40 тон, годам пазней ён разам з Паўлам Сарокай працягнуў чыгуначны састаў, які складаўся з пяці вагонаў, яго вага — 250 тон. Наступным дасягненнем стаў транспартны самалёт «Іл-76», а затым і танк «Т-34». У 2011 годзе Кірыл паставіў сабе задачу зрушыць «БелАЗ» і вырашыў яе, а сёлета стронгмен пайшоў далей, яго мэтай стаў вежавы кран вагой 118 тон. Сёння ў Кнігу рэкордаў Гінеса занесены тры дасягненні беларуса.

— Які з рэкордаў быў самым складаным?

— Фізічна ні адзін з іх не быў лёгкім, бо гэта не цырк, не фокусы, тут усё пасапраўднаму. У плане арганізацыі самым складаным было першае сур'ёзнае дасягненне, калі мы з Паўлам Сарокай рухалі чыгуначны састаў. Тады мы былі яшчэ не вядомыя шырокаму колу людзей, даводзілася вырашаць масу пытанняў: пачынаючы з дазволу атрымаць вагоны, заканчваючы прыцягненнем СМІ. Мне хацелася зрабіць свята, каб былі вядучыя, шоу і гэтак далей. Мы з Паўлам займаліся арганізацыяй каля 4-х месяцаў, але галоўнае, што ўсё атрымалася.

— Раскажыце пра сваё апошняе дасягненне з утрыманнем самалётаў.

— У верасні японскае тэлебачанне прыехала ў Беларусь, каб здымаць адну з серый праграмы «Вакол свету». Яны ездзяць па многіх краінах і робяць падобныя праекты. У праграме распавядаецца пра культуру рэгіёна, традыцыі, сімвалы краіны.

Японцы здымалі Белавежскую пушчу, зуброў, беларускіх дзяўчат, паказваючы прыгажосць, а сімвалам краіны ў якасці чалавека, на іх думку, падкрэсліваю, на іх думку, аўтары праграмы выбралі мяне. Я быў неверагодна здзіўлены. Вялікая адказнасць для мяне — быць брэндам краіны, таму трэба было зрабіць нешта асаблівае і магчыма ўстанавіць яшчэ нейкі рэкорд. Так прыйшла ідэя ўтрымаць самалёты «Як-52», якія раз'язджаюцца ў розныя бакі ў рэжыме фарсажу. Гэта, вядома, вар'яцкі ўчынак, вялікая рызыка, бо адбыцца магло ўсё што заўгодна. Дзякуй Богу, усё атрымалася, японцы засталіся пад вялікім уражаннем. 1 лістапада яны будуць вяшчаць праграму на ўсю краіну, аўдыторыя — 130 мільёнаў чалавек, гэта нешта ўнікальнае.

«Убачыўшы мяне ўпершыню, чалавек можа падумаць: сіла ёсць — розуму не трэба».

— Наколькі складана арганізаваць дасягненне, каб яно было занесена ў Кнігу рэкордаў Гінеса?

— Там існуе мноства падводных камянёў, трэба запрашаць спецыяльную камісію, вырашаць масу арганізацыйных пытанняў, укласці фінансавыя сродкі. Гэта ўсё здольна выбіць чалавека з фізічных і маральных сіл. У чытачоў можа паўстаць пытанне, а ці плацяць мне за рэкорды? Адказваю: ніякай фінансавай выгады рэкорд, занесены ў Кнігу рэкордаў Гінеса не прыносіць.

— Тады навошта вы гэта робіце?

— Я атрымліваю задавальненне. І ні ў якім разе сваімі ўчынкамі не хачу каму-небудзь штосьці даказаць — гэта мая жыццёвая пазіцыя. Рэкорды — не самамэта, пражыць жыццё можна, вядома, і лежачы на канапе, але кожны, напэўна, хоча пакінуць пасля сябе след. Я люблю здзіўляць людзей і разбураць стэрэатыпы. Дзякуючы маім вар'яцкім учынкам, мяне сталі слухаць людзі, а гэта каштуе дорага і дае спосаб данесці сваю філасофію.

«Вялікімі не нараджаюцца»

— У чым заключаецца ваша філасофія?

— Убачыўшы мяне ўпершыню, чалавек можа падумаць: сіла ёсць — розуму не трэба. Таму што асноўная маса людзей жыве стэрэатыпамі. Варта задумацца і зразумець, што сам па сабе кожны чалавек унікальны, не бывае двух аднолькавых людзей, кожны ёсць асоба, якую трэба развіваць з дзяцінства. Толькі пасля разважанняў, хто я ў гэтым жыцці, чаго хачу, навошта і чаму, мне многае адкрылася. Каб стаць паспяховым, трэба дарыць дабро, любіць людзей, быць асобай з характарам і не баяцца рабіць так, як іншыя баяцца нават думаць. Мне вельмі падабаецца здзіўляць не толькі сваімі вар'яцкімі ўчынкамі, зрушваючы танкі, самалёты, цягнікі і нават краны, але таксама сваімі поглядамі. Не трэба пераймаць штосьці ў іншых, варта развіваць тыя якасці, якія ўласцівы толькі табе і нікому навокал. Перайманне заўсёды выглядае смешна.

— Вы лічыце, што харызму можна набыць з цягам жыцця?

— Так! Вялікімі людзьмі не нараджаюцца, а становяцца. Развіваць яе трэба з дзяцінства, менавіта ў гэты час закладваецца падмурак асобы чалавека. Спорт, дарэчы, з'яўляецца выдатным сродкам для развіцця.

— Вас называюць самым моцным чалавекам Беларусі ці нават свету, але вам гэта не падабаецца. Чаму?

— Таму што я не самы моцны. На кожнага моцнага будзе наймацнейшы, на кожнага разумнага будзе разумнейшы, не бывае самага-самага. Людзі пастаянна спрабуюць знайсці мерку сіле, прыгажосці, розуму, а гэта немагчыма.

Прывяду прыклад, я моцны ў сваёй вобласці, але чалавек, які займаецца армрэслінгам, не прысядзе з такой вялікай вагой штангі, як, напрыклад, цяжкаатлет.

«Я магу з'есці булачку»

Пасля перамог над тонамі жалеза Кірыл Шымко пачаў займацца сацыяльнымі праектамі, арганізаваў уласную школу здаровага ладу жыцця, пачаў здымацца ў кіно, выступае з шоу, дзе скручвае патэльні, забівае цвікі рукой, ірве жалезныя ланцугі. А хутка асілак запускае свой тэлевізійны праект «Рэкорды сілы».

— Вы прапагандуеце здаровы лад жыцця, але ці можна назваць ваш занятак здаровым?

— Для чалавека карысная фізічная актыўнасць, а тое, што паказваю я, — гэта магчымасці арганізма. Я, вядома, не трэніруюся так кожны дзень, проста такія прыклады, як мой, даюць чалавеку відавочны вобраз таго, што можна быць недзе падобным да мяне: стаць мацней, сфарміраваць сябе.

— Вы кажаце пра тое, што трэба разбураць стэрэатыпы і не прытрымлівацца моды, але здаровы лад жыцця таксама стаў модным. Як з гэтым быць?

— Гэтая мода носіць неразбуральны характар, таму не бачу ў ёй нічога дрэннага. Калі мы будзем глядзець на гэтае пытанне глабальна, то мода на здаровы лад жыцця фарміруе не толькі чалавека, але і нацыю. Калі мы хочам мець моцную краіну, то нам патрэбны моцныя духам і целам людзі, а не слабакі, з якімі мы нічога не пабудуем. Мне асабіста вельмі прыемна, што сёння з'яўляюцца іншыя стэрэатыпы.

— Можна сказаць, што наша грамадства мяняецца?

— Не ведаю, як мяняецца, але тое, што ў грамадстве з'яўляецца жаданне выглядаць лепш — гэта дакладна. Што такое наогул здаровы лад жыцця? Здароўе немагчыма памацаць, усвядоміць і зразумець. Кожны чалавек хоча змяніцца: кожная дзяўчына хоча схуднець, кожны хлопец хоча набраць больш мышцаў, а шлях да дасягнення ідэальнай фігуры ляжыць праз здаровы лад жыцця. Гэта значыць, ЗЛЖ — здольнасць змяніць сваё харчаванне і звычкі. Хутка я, дарэчы, запускаю праект аб правільным харчаванні «Будзь здаровы!».

— Самі, зразумела, прытрымліваецеся прынцыпаў правільнага харчавання, але даяце часам сабе слабіну?

— Вядома, усе мы людзі. Я магу з'есці булачку ці дранікі. Перш за ўсё, кожны павінен для сябе зразумець, што есці добра, а што дрэнна. Калі вам падабаецца шакалад і вы не можаце жыць без яго — дазвольце сабе любімы ласунак раз на тыдзень. Калі вы паставіце жорсткую забарону, так ці інакш калі-небудзь сарвяцеся, і гэта будзе нашмат горш.

— Вы яшчэ і творчы чалавек, здымкі ў кіно вам цікавы?

— Я іграў у асноўным эпізадычныя ролі бандытаў і ахоўнікаў. І спачатку мне гэта было вельмі цікава, цяпер ужо, вядома, не так. Але нядаўна прапанавалі ролю ў поўнаметражнай карціне, гэта будзе нешта накшталт казкі.

— Людзі на вуліцы, мусіць, вас пазнаюць?

— Гэта мяне не напружвае, не раздражняе і я ад гэтага не «задзіраю» нос. Лічу, што толькі невялікай колькасці людзей на планеце ёсць чым ганарыцца, і тое, як правіла, яны гэтага не робяць. Напрыклад, Біл Гейц, Стыў Джобс, Генры Форд. Эталонам для мяне ў гэтым сэнсе з'яўляецца Фёдар Емяльяненка — чалавек вялікай душы, мужнасці, сілы, сапраўдны рускі волат. Пры гэтым вельмі сціплы.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.
lobazhevich@zviazda.by

— Наколькі складана арганізаваць дасягненне, каб яно было занесена ў Кнігу рэкордаў Гінеса?

— Там існуе мноства падводных камянёў, трэба запрашаць спецыяльную камісію, вырашаць масу арганізацыйных пытанняў, укласці фінансавыя сродкі. Гэта ўсё здольна выбіць чалавека з фізічных і маральных сіл. У чытачоў можа паўстаць пытанне, а ці плацяць мне за рэкорды? Адказваю: ніякай фінансавай выгады рэкорд, занесены ў Кнігу рэкордаў Гінеса не прыносіць.

— Тады навошта вы гэта робіце?

— Я атрымліваю задавальненне. І ні ў якім разе сваімі ўчынкамі не хачу каму-небудзь штосьці даказаць — гэта мая жыццёвая пазіцыя. Рэкорды — не самамэта, пражыць жыццё можна, вядома, і лежачы на канапе, але кожны, напэўна, хоча пакінуць пасля сябе след. Я люблю здзіўляць людзей і разбураць стэрэатыпы. Дзякуючы маім вар'яцкім учынкам, мяне сталі слухаць людзі, а гэта каштуе дорага і дае спосаб данесці сваю філасофію.

«Вялікімі не нараджаюцца»

— У чым заключаецца ваша філасофія?

— Убачыўшы мяне ўпершыню, чалавек можа падумаць: сіла ёсць — розуму не трэба. Таму што асноўная маса людзей жыве стэрэатыпамі. Варта задумацца і зразумець, што сам па сабе кожны чалавек унікальны, не бывае двух аднолькавых людзей, кожны ёсць асоба, якую трэба развіваць з дзяцінства. Толькі пасля разважанняў, хто я ў гэтым жыцці, чаго хачу, навошта і чаму, мне многае адкрылася. Каб стаць паспяховым, трэба дарыць дабро, любіць людзей, быць асобай з характарам і не баяцца рабіць так, як іншыя баяцца нават думаць. Мне вельмі падабаецца здзіўляць не толькі сваімі вар'яцкімі ўчынкамі, зрушваючы танкі, самалёты, цягнікі і нават краны, але таксама сваімі поглядамі. Не трэба пераймаць штосьці ў іншых, варта развіваць тыя якасці, якія ўласцівы толькі табе і нікому навокал. Перайманне заўсёды выглядае смешна.

— Вы лічыце, што харызму можна набыць з цягам жыцця?

— Так! Вялікімі людзьмі не нараджаюцца, а становяцца. Развіваць яе трэба з дзяцінства, менавіта ў гэты час закладваецца падмурак асобы чалавека. Спорт, дарэчы, з'яўляецца выдатным сродкам для развіцця.

— Вас называюць самым моцным чалавекам Беларусі ці нават свету, але вам гэта не падабаецца. Чаму?

— Таму што я не самы моцны. На кожнага моцнага будзе наймацнейшы, на кожнага разумнага будзе разумнейшы, не бывае самага-самага. Людзі пастаянна спрабуюць знайсці мерку сіле, прыгажосці, розуму, а гэта немагчыма.

Прывяду прыклад, я моцны ў сваёй вобласці, але чалавек, які займаецца армрэслінгам, не прысядзе з такой вялікай вагой штангі, як, напрыклад, цяжкаатлет.

«Я магу з'есці булачку»

Пасля перамог над тонамі жалеза Кірыл Шымко пачаў займацца сацыяльнымі праектамі, арганізаваў уласную школу здаровага ладу жыцця, пачаў здымацца ў кіно, выступае з шоу, дзе скручвае патэльні, забівае цвікі рукой, ірве жалезныя ланцугі. А хутка асілак запускае свой тэлевізійны праект «Рэкорды сілы».

— Вы прапагандуеце здаровы лад жыцця, але ці можна назваць ваш занятак здаровым?

— Для чалавека карысная фізічная актыўнасць, а тое, што паказваю я, — гэта магчымасці арганізма. Я, вядома, не трэніруюся так кожны дзень, проста такія прыклады, як мой, даюць чалавеку відавочны вобраз таго, што можна быць недзе падобным да мяне: стаць мацней, сфарміраваць сябе.

— Вы кажаце пра тое, што трэба разбураць стэрэатыпы і не прытрымлівацца моды, але здаровы лад жыцця таксама стаў модным. Як з гэтым быць?

— Гэтая мода носіць неразбуральны характар, таму не бачу ў ёй нічога дрэннага. Калі мы будзем глядзець на гэтае пытанне глабальна, то мода на здаровы лад жыцця фарміруе не толькі чалавека, але і нацыю. Калі мы хочам мець моцную краіну, то нам патрэбны моцныя духам і целам людзі, а не слабакі, з якімі мы нічога не пабудуем. Мне асабіста вельмі прыемна, што сёння з'яўляюцца іншыя стэрэатыпы.

— Можна сказаць, што наша грамадства мяняецца?

— Не ведаю, як мяняецца, але тое, што ў грамадстве з'яўляецца жаданне выглядаць лепш — гэта дакладна. Што такое наогул здаровы лад жыцця? Здароўе немагчыма памацаць, усвядоміць і зразумець. Кожны чалавек хоча змяніцца: кожная дзяўчына хоча схуднець, кожны хлопец хоча набраць больш мышцаў, а шлях да дасягнення ідэальнай фігуры ляжыць праз здаровы лад жыцця. Гэта значыць, ЗЛЖ — здольнасць змяніць сваё харчаванне і звычкі. Хутка я, дарэчы, запускаю праект аб правільным харчаванні «Будзь здаровы!».

— Самі, зразумела, прытрымліваецеся прынцыпаў правільнага харчавання, але даяце часам сабе слабіну?

— Вядома, усе мы людзі. Я магу з'есці булачку ці дранікі. Перш за ўсё, кожны павінен для сябе зразумець, што есці добра, а што дрэнна. Калі вам падабаецца шакалад і вы не можаце жыць без яго — дазвольце сабе любімы ласунак раз на тыдзень. Калі вы паставіце жорсткую забарону, так ці інакш калі-небудзь сарвяцеся, і гэта будзе нашмат горш.

— Вы яшчэ і творчы чалавек, здымкі ў кіно вам цікавы?

— Я іграў у асноўным эпізадычныя ролі бандытаў і ахоўнікаў. І спачатку мне гэта было вельмі цікава, цяпер ужо, вядома, не так. Але нядаўна прапанавалі ролю ў поўнаметражнай карціне, гэта будзе нешта накшталт казкі.

— Людзі на вуліцы, мусіць, вас пазнаюць?

— Гэта мяне не напружвае, не раздражняе і я ад гэтага не «задзіраю» нос. Лічу, што толькі невялікай колькасці людзей на планеце ёсць чым ганарыцца, і тое, як правіла, яны гэтага не робяць. Напрыклад, Біл Гейц, Стыў Джобс, Генры Форд. Эталонам для мяне ў гэтым сэнсе з'яўляецца Фёдар Емяльяненка — чалавек вялікай душы, мужнасці, сілы, сапраўдны рускі волат. Пры гэтым вельмі сціплы.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.
lobazhevich@zviazda.by



Дзе песня льецца...

ПА ГАРЫЗАНТАЛІ: 1. У нашых варот — заўсёды ... (прык). **5.** ... — багацце, а ўжыванне яе — дасканаласць (арабская прык.). **8.** Музычны інструмент нізкага рэгістра. **10.** Клавішы гармонікаў, духавых інструментаў. **11.** Элементарная адзінка музычнага метра. **12.** Дзе ..., там і песня (прык.). **14.** Скрынка для апускання выбарчых бюлетэняў. **16.** Вежа. **17.** Якія ..., такія і песні (прык.). **21.** Восеньская кветка. **22.** Дзе ... льецца, там шчасліва жывецца (прык.). **23.** Газіраваная фруктовая вада. **24.** Частка тэксту. **26.** Цвёрды мінерал. **27.** «Жыццё — ..., а мы ў ім экспанаты і наведвальнікі». С. Балакін. **29.** Беларуская багіня вяселля. **33.** Круг выбаршчыкаў. **35.** Лоўкі, эфектны нумар. **36.** У старажытных рымлян верхняе мужчынскае адзенне. **37.** І ... песні пяе, калі добра жыве (прык.). **38.** «... — адзіная гонка, у якой выйграе большасць удзельнікаў». Л.Пітэр. **39.** Буйны музычны твор.

ПА ВЕРТЫКАЛІ: 1. «... — гэта мера чалавечнасці ў чалавеку». К.Маркс. **2.** Парада, павучанне. **3.** Дзяржаўная ці грамадская ўстанова, арганізацыя. **4.** Венгерскі народны танец. **6.** «..., уяўленне і розум — гэта асяроддзе, дзе нараджаецца тое, што мы называем культурай». К. Паўстоўскі. **7.** Прадукт творчай працы. **9.** «У культуры асноваў служыць ...». Р. Ландау. **13.** Старажытнаегіпецкі бог Сонца. **15.** Інфармацыя ў друку пра што-небудзь. **18.** Умацаванне сценак буравой свідравіны трубамі. **19.** Язычковы драўляны музычны інструмент. **20.** «... фарміруе культуру аптымізму, культуру бодрасці». А. Луначарскі. **23.** Выкананне музычных гукаў адрывіста, раздзяляючы адзін ад аднаго паўзамі. **25.** Жанр цыркавога мастацтва. **28.** Частка агнястрэльнай зброі. **29.** Шостая нота музычнай гамы. **30.** Узвышаная частка хрысціянскага храма. **31.** «Кожнае ... — гэта развітанне». Я. Іпахорская. **32.** «... Нясвіжа», міжнародны фестываль камернай музыкі, які праводзіцца ў г. Нясвіжы. **34.** Музычны твор, прызначаны для выканання адным музыкантам, спеваком, танцорам.

Склаў Лявон ЦЕЛЕШ,
г. Дзяржынск.

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ДАСКА, АДКАЗЫ ПА ГАРЫЗАНТАЛІ: 1. Карагод. 5. Асвета. 8. Бас. 10. Лады. 11. Доля. 12. Маладосць. 14. Урна. 16. Выпіска. 17. Часці. 21. Астра. 22. Песня. 23. Сіро. 24. Радок. 26. Агат. 27. Мужык. 29. Лада. 33. Электарат. 35. Трук. 36. Тога. 37. Кот. 38. Выбарэ. 39. Квартэт. **ПА ВЕРТЫКАЛІ:** 1. Куплэт. 2. Рада. 3. Органі. 4. Чарадзей. 6. Сэрца. 7. Твор. 9. Вяршынь. 13. Ра. 15. Нагатка. 18. Абсадка. 19. Гадоў. 20. Спорт. 23. Стаката. 25. Клаўнада. 28. Затвор. 29. Ля. 30. Алтар. 31. Танга. 32. Муэы. 34. Сола.

Даты Падзеі Людзі

12 КАСТРЫЧНІКА

1350 год — 665 гадоў таму нарадзіўся Дзмітрый Іванавіч, вялікі князь маскоўскі і ўладзімірскі. Узначаліў барацьбу Русі супраць панавання Залатой Арды, разграміў татара-мангольскае войска на рацэ Вожа. У 1380 г. выступіў на чале аб'яднанага рускага войска насустрач полчышчам хана Мамая і ў бітве на Куліковым полі (у вярхоўях Дона), цалкам разграміў яго, за што быў празваны нашчадкамі Данскім.

1931 год — У СССР прынята рашэнне аб поўнай ліквідацыі прыватнага гандлю. Эканамічны і палітычны крызісы, якія ахапілі краіну пры «ваенным камунізме», прымусілі палітычнае кіраўніцтва шукаць выйсця з іх. Пераход ад «ваеннага камунізму» да «новай эканамічнай палітыкі» (НЭП) быў абвешчаны X з'ездам РКП у сакавіку 1921 года. Першапачатковая ідэя пераходу была сфармулявана ў працах У.І. Леніна 1921—1923 гадоў: канчатковая мэта застаецца ранейшай — сацыялізм, але становішча Савецкай Расіі пасля грамадзянскай вайны дыктуе неабходнасць звярнуцца да «рэфармісцкага» метаду дзеянняў у карэнных пытаннях эканамічнага будаўніцтва. Асноўныя захады, праведзеныя ў рамках НЭП: харчразвёрстка была заменена харчовым падаткам, легалізаваўся свабодны гандаль, прыватныя асобы атрымалі права займацца саматужнымі промысламі і адкрываць прамысловыя прадпрыемствы з лікам працоўных да ста чалавек. Дробныя нацыяналізаваныя прадпрыемствы вярталіся ранейшым уладальнікам. Натуральная аплата працы заменена грашовай, быў заснаваны новы дзяржаўны банк і адноўлена сістэма банкаў. НЭП прывяла да хуткага ажыўлення эканомікі. Эканамічная зацікаўленасць у вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі, якая з'явілася ў сялян, дазволіла хутка насыціць рынак прадуктамі і пераадолець наступствы галодных гадоў «ваеннага камунізму». Аднак ужо з сярэдзіны 1920-х гадоў, пасля смерці Леніна, меры па стрымліванні развіцця НЭП змяніліся курсам на яе згортванне. А 27 снежня 1929 года ў прамове на канферэнцыі гісторыкаў-марксістаў Сталін заявіў: «Калі мы і прытрымліваемся НЭПа, то гэта таму, што яна служыць справе сацыялізму. А калі яна перастане служыць справе сацыялізму, мы новую эканамічную палітыку адкінем да д'ябла». І адкінулі: 12 кастрычніка 1931 года быў адменены прыватны гандаль (акрамя калгасных рынкаў). Усе прыватныя крамы былі нацыяналізаваны. У ходзе ліквідацыі канфіскоўвалася ўся маёмасць сялян-кулакоў, іх высылалі ў Сібір, а гарадскіх «нэпманаў», а таксама членаў іх сем'яў, пазбаўлялі палітычных правоў (з'явілася такая катэгорыя насельніцтва — «пазбаўленцы»). Але афіцыйная забарона не змагла канчаткова выціснуць недзяржаўны гандаль з грамадскага жыцця. Ценявая эканоміка доўга яшчэ заставалася характэрнай рысай савецкай рэчаіснасці.

1950 год — нарадзіўся (г. Ашмяны) Валерый Паўлавіч Колас, беларускі фізік, доктар фізіка-матэматычных навук (1992). У 1973 годзе скончыў БДУ. Аўтар навуковых прац па тэрмадынаміцы гетэрагенных сістэм і рэактарабудаванні. Распрацаваў фізіка-матэматычнае забеспячэнне праектавання ядзерных рэактараў з мікратэламі, аўтаматызаваныя сістэмы прамянёвага забеспячэння тэхналагічных умоў у прамысловасці, сельскай гаспадарцы, медыцыне і арганізаваў іх вытворчасць.

Было сказана

Кастусь ЦВІРКА, паэт:
Хай свеціцца між зорак у сусвеце
Зямля — людскі наш інтэрнат.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	7.31	18.20	10.49
Віцебск	7.22	18.08	10.46
Магілёў	7.21	18.10	10.49
Гомель	7.16	18.09	10.53
Гродна	7.46	18.36	10.50
Брэст	7.44	18.38	10.54

Месяц

Маладзік 13 кастрычніка.
Месяц у сузор'і Шаляў.

Імяніны

Пр. *Івана.*
К. *Максіміліяна, Серафіма.*

Фота Надзеі БУЖАН.

ЗАЎТРА



...у суседзяў

ВАРШАВА	+2..+4°C	КІЕЎ	+5..+7°C	РЫГА	+6..+8°C
ВІЛЬНЮС	+6..+8°C	МАСКВА	+4..+6°C	С.-ПЕЦЯРБУРГ	+5..+7°C

УСМІХНЕМСЯ

Даказана, што першыя тры класы для дзіцяці ў школе — гэта спаборніцтвы паміж бацькамі: хто лепш малюе, клеіць і лепіць.

— Добры дзень. Я б хацеў купіць сумачку ў падарунак сваёй дзяўчыне.

— Мадэль? Колер?

— Ды давайце любую, яна ўсё роўна прыйдзе яе мяняць.

Мужчыны — як мышы. Асобна глядзіш — добранькі, пяшчотны звярок, а як у доме заведзяце — адразу хочацца атруціць!



caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 20.654. Індэкс 63850. Зак. № 4096.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 11 кастрычніка 2015 года.